# ВОДГУК

на аўтарэферат дысертацыі
Мурашкі Наталлі Уладзіміраўны
«Мадэляванне маўленчага адукацыйнага асяроддзя
сродкамі фальклору на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі», прадстаўленай на
саісканне вучонай ступені кандидата педагагічных навук па спецыяльнасці
13.00.02 – тэорыя і методыка навучання і выхавання
(вучнёўскай і студэнцкай моладзі)

Дысертацыйнае даследаванне Н. У. Мурашкі прысвечана праблеме мадэлявання маўленчага адукацыйнага асяроддзя сродкамі фальклору на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі. Ва ўвядзенні аўтар абгрунтоўвае актуальнасць дадзенага даследавання, вызначанага шэрагам супярэчнасцяў: паміж парытэтным функцыянальным статусам беларускай і рускай моў і дамінаваннем рускай мовы ў камунікацыі над беларускай; аб'ектыўнай патрэбай грамадства ў білінгвальнай асобе, якая свабодна гаворыць, піша, выкарыстоўвае ў зносінах беларускую мову нароўне з рускай і адсутнасцю натуральнага беларускамоўнага асяроддзя; патэнцыялам фальклорных твораў для стварэння маўленчага адукацыйнага асяроддзя і недастатковым выкарыстаннем яго магчымасцей у адукацыйным працэсе пачатковай школы. Ва ўмовах глабалізацыі і інфарматызацыі неадкладнае вырашэнне гэтых супярэчнасцяў набывае асаблівае значэнне, паколькі захаванне нацыянальнай ідэнтычнасці, моўнай культуры, духоўнай спадчыны робіцца стратэгічнай задачай не толькі сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь, але і беларускага грамадства ў цэлым.

Даследаванне абапіраецца на сучасныя ўяўленні пра маўленчае адукацыйнае асяроддзе, у якое аўтар прыўносіць аспект яго стварэння сродкамі фальклору. Усё гэта, у сукупнасці з недастатковай распрацаванасцю дадзенай праблематыкі ў сучаснай тэорыі і практыцы, дазваляе сцвярджаць аб сапраўднай актуальнасці дысертацыйнага даследавання Н. У. Мурашкі, яго тэарэтычнай і практычнай значнасці.

Дысертацыйнае даследаванне выканана з апорай на палажэнні ўзроставай псіхалогіі, тэорыі дзейнасці, даследванні ў галіне фальклорыстыкі, а таксама адпавядае асноўным напрамкам Праграмы бесперапыннага выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі на 2021–2025 гг. і праграмам па вучэбных прадметах "Беларуская мова", "Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)" для I ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

Дысертацыя адказвае заяўленай тэме, з'яўляецца завершанай і па сваёй структуры складаецца з уводзін, агульнай характарыстыкі работы, двух глаў, заключэння, бібліяграфічнага спісу, дадаткаў.

Сур’езанай увагі заслугоўвае прадстаўленая ў працы мадэль стварэння маўленчага адукацыйнага асяроддзя сродкамі фальклору, накіраваная на ўзнаўленне натуральнага моўнага асяроддзя і фарміраванне маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў. Адменную цікавасць для педагагічный навукі і практыкі ўяўляе прапанаваная аўтарам модульная методыка фарміравання маўленча-камунікатыўнай кампетэнцыі малодшых школьнікаў. Выкарыстанне фальклорных твораў як асноўнага механізму функцыянавання маўленчага адукацыйнага асяроддзя забяспечвае глыбокае засваенне матэрыялу і развіццё моўных навыкаў навучэнцаў.

Вынікі даследавання апрабаваны падчас навуковых канферэнцый і семінараў, у дастатковай ступені апублікаваны ў рэцэнзуемых выданнях. Афармленне аўтарэферата адпавядае патрабаванням ВАК РБ.

Дысертацыя Мурашка Наталлі Уладзіміраўны «Мадэляванне маўленчага адукацыйнага асяроддзя сродкамі фальклору на І ступені агульнай сярэдняй адукацыі» з’яўляецца арыгінальным даследаваннем і адпавядае патрабаванням да кандыдацкіх дысертацый адпаведнай навуковай галіны.

Аўтар заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата педагагічных навук па спецыяльнасці 13.00.02 – тэорыя і методыка навучання і выхавання (вучнёўскай і студэнцкай моладзі).

Дацэнт кафедры сучасных адукацыйных
Тэхналогій дзяржаўнай ўстановы адукацыі
“Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы”,
кандыдат педагагічных навук, дацэнт В.В. Гракава

Подпись удостоверяю
Начальник центра кадрового и документационного обеспечения
________________ 20____

ЦЕНТР КАДРОВОГО И ДОКУМЕНТАЦИОННОГО ОБЕСПЕЧЕНИЯ
РЕСПУБЛИКАНСКИЙ ИНСТИТУТ ВЫСШЕЙ ШКОЛЫ